*Фотарэпартаж*

# У ТРЫКАТАЖНАЙ...

Вялікай папулярнасцю не толькі ў Салігорску,але і ў жыхароў іншых гарадоў і вёсак карыстаюцца вырабы трыкатажнай майстэрні Салігорскага камбіната бытавога абслугоўвання. Калі мы зайшлі сюды, быў звычайны рабочы дзень. Працавалі ўсе цэхі. Загадчыца майстэрні Ніна Мікалаеўна Панцялеева задаволена работай майстроў.

— Вось паглядзіце, як увіхаецца каля фангавай машыны Ксенія Пятроўна Мурашка, ніхто за ёю не ўгоніцца, нездарма ж яе сяброўкі часцяком зазначаюць: «Старанная жанчына, любіць сваю справу».

Ксенія Пятроўна—выдатны майстар. Нават тады, калі машына пачынае не слухацца яе, капрызнічаць, Ксенія Пятроўна хутка знаходзіць пашкоджанні. На здымку, які вы бачыце справа, Ксенія Пятроўна папраўляе нітку, уважліва сочыць, каб не праскочылі на гатовы выраб вузлы. Яна ж член камісіі майстэрні па якасці. 90 вырабаў— такі вынік работы Ксеніі Мурашка за мінулы месяц. Амаль у два разы яна перакрыла даведзены план. Некалькі тысяч заказчыкаў апрануліся ў трыкатажныя вырабы, зробленыя рукамі гэтай працавітай жанчыны за чатырохгадовы перыяд работы ў майстэрні.






Лідзія Андрэеўна Тычына (здымак злева) працуе ў майстэрні з дня яе заснавання.

Цяпер Лідзія Андрэеўна асвоіла два апараты. Да красавіка мінулага года працавала на «Медзе», затым —на «Кашубке». Ручная вязка, хаця яна і механізаваная, — надзвычай складаная справа. Калі фангаўшчыцы выпускаюць за дзень два вырабы, то пры ручной вязцы — за два дні адзін выраб. Затое карыстаюцца яны вялікай павагай заказчыкаў, асабліва мужчынскія палуверы і світэры, якія выклікалі вялікую цікавасць на мастацкім савеце ў Мінску. Выканаўца іх Лідзія Тычына адзначана прэміяй.

Узяўшы павышаныя абавязацельствы на трэці год пяцігодкі, юбілейны год Савецкай Беларусі,працаўнікі майстэрні працуюць з падвоенай энергіяй. Па выніках мінулага года яны прэтэндэнты на першае месца сярод калектываў раённага камбіната бытавога абслугоўвання.

**Фота Л. ПАЦЯРАЙЛА.**

**Л. ДЗЕНІСЮК.**

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА